Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

29 снежня 2017 года, № 20 (2188)

Дарагія сябры – калегі, студэнты!

Прыміце шчырыя віншаванні з надыходзячым Новым годам!

Новы год – асаблівае свята, з якім звязана шмат спадзяванняў, планаў і мэт. Гэта чаканне светлых і казачных падзей, радасных дзён і яркіх уражанняў.

Новы год дае магчымасць чалавеку адкрываць і ствараць сябе, напаўняе жыццё зместам і сэнсам. Гэтага можна дасягнуць, зазірнуўшы ўнутр сябе, дзе знаходзяцца адказы на шматлікія пытанні. Бо адкрыцці – гэта не пошук новых земляў, а погляд на свет сваімі вачыма.

Жадаю знайсці ў сабе нязведаныя глыбіні, а значыць, дасягнуць новых вышынь у жыцці сваім і любімага ўніверсітэта. Здароўя, кахання, дабра і гармоніі з сабой і навакольлем, сямейнага цяпла і ўтульнасці!

З павагай, рэктар БДУ ***Андрэй Кароль***

МАНІТОРЫНГ

У новым рэйтынгу

БДУ ўпершыню ўвайшоў у 200 найлепшых універсітэтаў па версіі Маскоўскага міжнароднага рэйтынгу «Тры місіі ўніверсітэта» (MosIUR). У дадзеным спісе пілотнай версіі новага рэйтынгу адзначаны ўніверсітэты з 39 краін. БДУ размясціўся на 168 месцы і стаў адзіным прадстаўніком Беларусі з тых, якія трапілі ў выніковую рэйтынгавую табліцу.

Маскоўскі міжнародны рэйтынг ВНУ – прынцыпова новы акадэмічны рэйтынг, які ацэньвае тры ключавыя місіі ўніверсітэта: адукацыйную, навуковую і ўзаемадзеянне з грамадствам.

Рэйтынг выкарыстоўвае цэлы шэраг крытэрыяў, разлічаных па аб'ектыўных дадзеных, і выключае суб'ектыўныя рэпутацыйныя апытанні. Метадалогія ранжыравання прайшла маштабнае грамадскае абмеркаванне ў Расіі і



за мяжой, у ім прынялі ўдзел звыш 100 універсітэтаў.

Верхнія тры пазіцыі ў рэйтынгу займаюць амерыканскія ўніверсітэты: Гарвардскі ўніверсітэт (1 месца), Масачусецкі тэхналагічны інстытут (2 месца) і Стэнфардскі ўніверсітэт (3 месца). Найбольш шырока прадстаўлены таксама ВНУ кантынентальных еўрапейскіх краін (48 універсітэтаў) і ЗША (41 ВНУ). Сярод расійскіх універсітэтаў лідзіруе МДУ імя М.В. Ламаносава, які размясціўся на 25 пазіцыі. У першай сотні найлепшых ВНУ свету таксама размясціліся Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (72 месца) і Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут (73 месца). Усяго ў табліцы рэйтынгу адзначаны 13 расійскіх устаноў вышэйшай адукацыі.

З краін-суседзяў Беларусі ў рэйтынг увайшлі Варшаўскі ўніверсітэт (158 месца), Ягелонскі ўніверсітэт (181 месца), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Т. Шаўчэнкі (193 месца).

Павел САЛАЎЁЎ

У нумары:

ВЫБІРАЮЦЬ БДУ
Падведзены вынікі прыёму замежных студэнтаў
Стар. 2

РЭЙТЫНГ АЦЭНКІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ:
ад сістэмы крытэрыяў да інструмента рэалізацыі стратэгічнага развіцця
Стар. 4–5

СУЗОР'Е ЎНІВЕРСІТЭТА СТВАРАЕЦЦА КОЖНЫМ З ВАС!
Навагодняе апытанне прарэктараў і заўважных жанчын нашага ўніверсітэта
Стар. 6–7

Весткі з рэктарата

У БДУ створаны ***савет па лічбавай трансфармацыі***.

Савет стане кансультатыўным органам для рэктара БДУ і будзе вызначаць стратэгічныя напрамкі павышэння эфектыўнасці працы ўніверсітэта, ажыццяўляць распрацоўку прапаноў па мадэрнізацыі і аптымізацыі адукацыйных, навуковых і адміністрацыйных працэсаў, структуры і функцый падраздзяленняў і службаў. За ім замацаваны таксама функцыі маніторынгу і кантролю, аналізу і каардынацыі працэсаў лічбавай трансфармацыі і інфарматызацыі БДУ.

Старшынёй савета прызначаны загадчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій ФРКТ ***Юрый Варатніцкі***. У склад увайшлі загадчык кафедры клеткавай біялогіі і біяінжынеры раслін біялагічнага факультэта ***Вадзім Дзямідчык***, начальнік ЦІТ ***Віктар Кочын***, начальнік ГУВНМР ***Людмила Хухлындзіна***, загадчыца кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта ***Вольга Чупрыс*** і дэкан ФМА ***Віктар Шадурскі***.

* * *

ПРАРЭКТАРАМ па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці БДУ прызначаны ***Міхаіл Чарапеннікаў***. Адпаведны загад ад 07.12.2017 падпісаў рэктар БДУ Андрэй Кароль.

* * *

СТАРШЫНЁЙ пярвічнай арганізацыі БДУ РГА «Белая Русь» абраны прарэктар па вучэбнай рабоце ***Сяргей Ходзін***. Выбары адбыліся 7 снежня. На мерапрыемстве прысутнічаў намеснік старшыні Маскоўскай раённай арганізацыі Мінска РГА «Белая Русь» ***Ігар Цыбін***, які выказаў упэўненасць у тым, што пад кіраўніцтвам новага старшыні будзе рэалізавана мноства цікавых праектаў.

Пярвічная арганізацыя РГА «Белая Русь» была створана 14 снежня 2007 г. на сходзе прадстаўнікоў працоўнага калектыву БДУ. У розныя гады яе старшынямі былі: Васіль Стражаў, Анатоль Рубанаў, Уладзімір Рагавіцкі.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Выбіраюць БДУ

Падведзены вынікі прыёму замежных студэнтаў

Папулярнасць універсітэта сярод прадстаўнікоў іншых дзяржаў прыкметна ўзрастае. У БДУ стала вядомай колькасць залічаных замежных грамадзян на падрыхтоўчае аддзяленне, I і II ступені вышэйшай адукацыі, аспірантуру. Дапамог разабрацца ў гэтых лічбах **Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ,** дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі, адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ.

Агульная колькасць залічаных у БДУ

На 30 лістапада вынікі прыёму замежных грамадзян сведчаць, што паказчыкі выраслі ў параўнанні з мінулым годам. На I ступень атрымання вышэйшай адукацыі прынята **460** замежных грамадзян (у 2016 – 322), на 2 ступень – 190 (у 2016 – 207), у аспірантуру – 38 (у 2016 – 22), у юрыдычны каледж – 3 (у 2016 – 1), на падрыхтоўчае аддзяленне ФДА – 266 (у 2016 – 227).

Акрамя гэтага былі прыняты на ўключанае навучанне 64 студэнты на старэйшыя курсы па такіх адукацыйных праграмах, як «Эразмус» (35 у 2016), а менавіта: на філфак – 28, ФМА – 12, ІБМТ – 12, фізфак – 12 студэнтаў.

У агульны падлік яшчэ ўключаецца тая колькасць замежных грамадзян, якія паступалі на такіх жа ўмовах, як і беларусы. З улікам дадатковых адукацыйных паслуг (стажыроўкі, моўныя курсы, летняя школа рускай мовы, павышэнне кваліфікацыі) БДУ выходзіць на паказчык 1197 замежных грамадзян (гэта на 165 больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года).

Як адзначае Вячаслаў Міхайлавіч Малафееў, прыкметны рост паступлення замежных грамадзян у БДУ звязаны з развіццём сумесных адукацыйных праграм з замежнымі партнёрамі, чаму наш універсітэт надае вялікую ўвагу на працягу апошніх 5 гадоў. Апроч гэтага, 2/3 выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення ў далейшым складаюць кантынгент нашага ўніверсітэта.

З якіх краін да нас прыязджаюць? Калі казаць пра лічбы ў разрэзе краін (вышэйшая адукацыя і аспірантура), то маем наступныя дадзеныя: з Кітая – 400 студэнтаў (на 128 больш, чым у 2016), з Туркменістана – 110 (больш на 6 чалавек, чым у 2016), з Таджыкістана – 44 (больш на 37 чалавек, чым у 2016). А яшчэ гэта прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі, Арменіі, Азербайджана, Казахстана. Увогуле, геаграфія прадстаўлена сёлета 22 краінамі. А ва ўсім універсітэце на дадзены момант навучаюцца студэнты з 50 краін.

– У адпаведнасці з дзейнымі правіламі прыёму замежных грамадзян на I і II ступені ажыццяўляецца па выніках сумоўя па мове навучання, гэта значыць па рускай мове, – кажа Вячаслаў Міхайлавіч. – На творчыя спецыяльнасці праходзіць сумоўе з удзелам прадстаўнікоў адпаведных факультэтаў. А на I ступень выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення залічваюцца без дадатковага сумоўя на падставе пасведчання пра заканчэнне падрыхтоўчага аддзялення.

У разрэзе факультэтаў

Якім жа факультэтам аддаюць перавагу замежнікі? У тройку лідараў па платнай форме (I і II ступені вышэйшай адукацыі і аспірантура) увайшлі **эканамічны факультэт** – 148 студэнтаў (у 2016 – 110), **факультэт міжнародных адносін** – 107 (у 2016 – 131) і **філалагічны факультэт** – 108 (у 2016 – 99). За імі ідуць юрыдычны факультэт, Інстытут журналістыкі, МДЭІ імя А. Д. Сахарава, ФПМІ, механіка-матэматычны факультэт і ІБМТ.

Сярод замежных студэнтаў I ступені атрымання вышэйшай адукацыі **191** чалавек (гэта 42 % ад агульнай колькасці) быў залічаны па сумесных адукацыйных праграмах (у 2016 – 58). У прыватнасці:

– 43 студэнты Таджыкскага нацыянальнага ўніверсітэта (ТНУ), якія навучаюцца па адукацыйных праграмах Інстытута тэхналогій БДУ–ТНУ, залічаны на 2 і 3 курс дзённай формы навучання на спецыяльнасці ФПМІ «Прыкладная матэматыка» і «Камп'ютарная бяспека», механіка-матэматычнага факультэта «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» і МДЭІ імя А. Д. Сахарава «Медыка-біялагічная справа».

– 30 студэнтаў залічана на 1 курс завочнай формы навучання ў Армянскі філіял МДЭІ імя А. Д. Сахарава на спецыяльнасць «Медыцынская экалогія». Навучанне вядзецца на англійскай мове.

У гэтым пераліку прадстаўлены і кітайскія ўніверсітэты:

– 22 студэнты Чэндускага інстытута Сычуанскага ўніверсітэта замежных моў залічаныя на 3 курс дзённай формы навучання на спецыяльнасць «Руская філалогія» філалагічнага факультэта.

– 15 студэнтаў Хэнанскага ўніверсітэта залічаныя на 3 курс дзённай формы навучання на спецыяльнасць «Журналістыка (аўдыявізуальная)». Плануецца, што з гэтым універсітэтам у далейшым будзе рэалізавана навучанне і ў магістратуры.

– 79 кітайскіх студэнтаў залічаны на 1 курс дзённай формы навучання ў сумесны інстытут з Далянскім політэхнічным універсітэтам на спецыяльнасць «Фізіка» і «Механіка і матэматычнае мадэляванне». Акрамя гэтага варта вылучыць, што навучанне зараз вядзецца ў Кітаі па адукацыйных стандартах БДУ і з удзелам нашых выкладчыкаў. Працоўная мова – англійская. Студэнты змогуць пасля выпуску атрымаць два дыпломы. Гэты праект стартаваў сёлета, а ў яго рэалізацыі задзейнічаны фізфак і мехмат.

– Па сумесных адукацыйных праграмах з ТНУ, Сычуанскім універсітэтам, Універсітэтам Хэнань навучальныя планы выбудаваны па схеме «2+2» ці «2+1+2», – каментуе Вячаслаў Міхайлавіч. – Гэта значыць, што першыя два гады вядзецца навучанне на радзіме ў адпаведнасці з узгодненымі з намі навучальнымі планамі, а затым студэнты прыязджаюць у БДУ на 3 курс. Умовы прыёму на 3 курс – гэта паспяховае праходжанне навучання на сваёй радзіме і валоданне рускай мовай. А ў каго недастатковы ўзровень ведання мовы, той праводзіць дадатковы год на падрыхтоўчым аддзяленні.

На такіх жа ўмовах, як і беларусы

Паводле правіл прыёму, грамадзяне Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, Рэспублікі Таджыкістан маюць права ўдзельнічаць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі на ўмовах, прадугледжаных для беларускіх грамадзян. Таму прадстаўнікі гэтых краін таксама здаюць цэнтралізаванае тэсціраванне, праходзяць уступныя іспыты. Варта адзначыць, што на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі некаторыя з іх праходзяць падрыхтоўку да здачы ЦТ.

Па міждзяржаўных дамовах без іспытаў могуць быць залічаны і грамадзяне іншых дзяржаў, такіх як Літва, Латвія, Малдова, Польшча.

Што да колькасці, то праз сістэму ўступных выпрабаванняў было прынята ў 2017 году **87** чалавек на I ступень (у мінулы перыяд – 85), а на II ступень – 34 (у мінулы перыяд – 12). Найбольшая колькасць зацікаўленых у вучобе ў БДУ прыбыла з Расійскай Федэрацыі: 59 грамадзян на I ступень і 20 на II ступень.

Гэтыя лічбы ў некаторай ступені паўплывалі на невялікае памяншэнне тых, хто паступіў на платную форму магістратуры: было залічана 190 слухачоў, што толькі на 17 чалавек менш, чым летась.

– Апошнія гады праводзілася работа па выпрацоўцы новай мадэлі і новых стандартаў магістратуры, якая з гэтага навучальнага года рэалізуецца, як правіла, па двухгадовым навучальным плане. Выбудаваная мадэль магістратуры адпавядае міжнародным адукацыйным стандартам, што дазваляе болей выразна весці інфармацыйную працу сярод партнёраў БДУ і замежных студэнтаў, – распавёў Вячаслаў Міхайлавіч.

Магістратура БДУ будуецца па дзвюх мадэлях: навукова-арыентаваная і практыка-арыентаваная. Таксама рост колькасці тых, хто паступае ў аспірантуру – гэта вынік паспяховага пераадолення II ступені.

Планы і перспектывы

Прыём замежных грамадзян працягваецца. На працягу ўсяго года ідзе прыём у магістратуру, набіраюцца групы падрыхтоўчага аддзялення, а пасля новага года пачнецца прыём на курсы рускай мовы і ў летнюю школу рускай мовы. У летняй школе ў 2017 годзе навучалася 82 чалавекі (у 2016 – 62). Летняя школа з'яўляецца досыць папулярнай, большасць яе слухачоў працягваюць у далейшым навучанне ва ўніверсітэце па праграмах I ступені або магістратуры.

– Думаю, для ўніверсітэта будзе цікавае далейшае развіццё партнёрскіх адносін з постсавецкімі краінамі, улічваючы тое, што досыць блізкія сістэмы вышэйшай адукацыі, напрыклад, у такіх дзяржавах, як Казахстан, Таджыкістан, Кыргызстан, Узбекістан, Азербайджан. Адпаведна тут можна чакаць больш актыўнай працы па рэалізацыі сумесных адукацыйных праграм, якія з'яўляюцца найбольш эфектыўным напрамкам па прыцягненні замежных студэнтаў, – дзеліцца Вячаслаў Міхайлавіч.

Таксама дэкан ФДА адзначае, што хуткім часам дадуць вынік сумесныя магістарскія праграмы. «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі» з Тэхнічным універсітэтам Мітвайда (Германія) – адна з такіх добра рэалізоўваных праграм:

– З нашага боку ў ёй удзельнічаюць эканамічны і факультэт міжнародных адносін. Гэта англамоўная праграма з выдачай двух дыпломаў рэалізуецца ўжо другі год. Такога роду сумесныя магістарскія праграмы могуць быць досыць цікавымі для нашых еўрапейскіх партнёраў, улічваючы, што ў нашага ўніверсітэта ёсць досыць трывалыя навуковыя сувязі з еўрапейскімі ўніверсітэтамі.

Алёна ЛЯЎШЭНЯ

Прыём замежных грамадзян
(на 30 лістапада 2017 г.)

№	Праграма	2013 г.	2014 г.	2015 г.	2016 г.	2017 г.
1	Першая ступень вышэйшай адукацыі	459	294	322	322	460
2	Магістратура	257	211	204	207	190
3	Аспірантура	23	5	19	22	38
4	Падрыхтоўчае аддзяленне ФДА	191	197	218	227	266
	Усяго прынята	1241	1088	1083	1115	1076 *на 30.11.2016 – 935*
	з улікам дадатковых адукацыйных паслуг (стажыроўкі, моўныя курсы, летняя школа рускай мовы, павышэнне кваліфікацыі)					

Паступленне замежных грамадзян (у разрэзе факультэтаў) на платную форму (вышэйшая адукацыя і аспірантура)

	2014	2015	2016	2017
Эканамічны ф-т	160	146	110	148
ФМА	123	84	131	107
Філалагічны ф-т	72	96	99	108
Юрыдычны ф-т	24	53	46	41
Інстытут журналістыкі	34	47	41	39
МДЭІ імя А. Д. Сахарава		5	36	45
ФПМІ	7	3	5	34
ММФ	4	9	3	14
ІБМТ	6	16	9	14

Прыём замежных грамадзян у разрэзе краін
(вышэйшая адукацыя і аспірантура)

	2015		2016		2017	
Кітай	229	42,0%	272	49,4%	400	58,1%
Туркменістан	138	25,3%	104	18,9%	110	16,0%
Таджыкістан	13	2,4%	7	1,3%	44	6,4%
Арменія	3	0,6%	37	6,7%	30	4,4%
Расійская Федэрацыя	33	6,1%	30	5,4%	33	4,8%
Казахстан	22	4,0%	13	2,4%	6	0,9%
Азербайджан	16	2,9%	9	1,6%	12	1,7%
Усяго	545		551		688	

ІНАВАЦЫІ

У рамках II З’езду навукоўцаў Беларусі 12 снежня ў БДУ адбыліся дзве навуковыя секцыі «Моладзь і новыя гарызонты навукі» і «Сучасная хімія і рацыянальнае прыродакарыстанне».

Беларусь інтэлектуальная

На ўрачыстым адкрыцці секцыі *«Моладзь і новыя гарызонты навукі»* прынялі ўдзел міністр адукацыі Беларусі **Ігар Карпенка,** рэктар БДУ **Андрэй Кароль,** старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі **Генадзь Пальчык,** Старшыня ДКНТ **Аляксандр Шумілін.**

У сваім вітальным слове рэктар *Андрэй Кароль* адзначыў, што БДУ з’яўляецца адным са стратэгічных каардынатараў навукова-даследчай працы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў. Напрыклад, кожны трэці ў спісе рэспубліканскай базы дадзеных адораных навучэнцаў з’яўляецца студэнтам БДУ, кожны пяты аспірант нашай краіны праходзіць навучанне ў БДУ. Летась кожная шостая кандыдацкая і доктарская праца, абароненая і зацверджаная ВАК Беларусі, выконвалася ў вядучым універсітэце краіны. Гэта, бясспрэчна, значны ўнёсак БДУ ў навукова-інавацыйнае развіццё Беларусі.

У працы навуковага форуму прынялі ўдзел каля 300 маладых навуковых беларускіх ВНУ, галіновай навукі і органаў дзяржаўнага кіравання. Дэлегаты абмеркавалі пытанні, якія тычацца асноўных напрамкаў развіцця навуковай сферы, інтэграцыі айчыннай навукі ў сусветную навуковую супольнасць, а таксама сувязі і ўзаемадзеянні навуковай дзейнасці маладых навукоўцаў з рэальным сектарам эканомікі. З дакладам «Роля навуковага кіраўніка і навуковай школы ў фарміраванні паспяховага маладога навукоўца» выступіў загадчык лабараторыі НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ **Міхаіл Арцем’еў**, а пра статус маладога навукоўца ў навуковай супольнасці распавяла дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права ФМА **Наталля Анцух**.

У працы секцыі *«Сучасная хімія і рацыянальнае прыродакарыстанне»* прынялі ўдзел каля 120 вядомых навукоўцаў. Сярод іх: акадэмік-сакратар аддзялення хіміі і навук пра Зямлю НАН Беларусі **Сяргей Усанаў**, дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі **Уладзімір Агабекаў**, генеральны дырэктар ДНВА «Хімічныя прадукты і тэхналогіі» **Мікалай Круцько**, дырэктар Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі **Анатоль Кулак** і іншыя. Навукоўцы абмеркавалі дасягнутыя вынікі ўніверсітэцкай і галіновай навукі, эфектыўнасць рэалізацыі дзяржаўных праграм у сферы навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці. Ключавымі пытаннямі абмеркавання сталі выкарыстанне здабытых прыродных рэсурсаў, іх аднаўленне, а таксама перапрацоўка адходаў вытворчасці.

На кожнай з секцый была арганізавана тэматычная выстава. На першай пляцоўцы, у Ліцэі БДУ, свае распрацоўкі прадставілі ўніверсітэты і арганізацыі, якія ўдзельнічалі ў працы секцыі «Моладзь і новыя гарызонты навукі». У рэктараце БДУ госці і ўдзельнікі навуковага форуму маглі азнаёміцца з дасягненнямі беларускіх навукоўцаў у галіне хіміі і навук пра Зямлю. БДУ тут прадставіў больш за 20 распрацовак.

Акрамя таго, БДУ прыняў удзел у агульнай міжведамаснай выставе, якая адкрылася 13 снежня ў Палацы Рэспублікі. Яна прайшла пад лозунгам «Беларусь інтэлектуальная» і складалася з васьмі сектараў, тэматычна звязаных з прыярытэтамі развіцця краіны: Беларусь як IT-краіна і тэхналогіі штучнага інтэлекту, электратранспарт, электроніка, нанаіндустрыя і адытыўная вытворчасць, касмічныя тэхналогіі, беспілотныя рабатызаваныя тэхналогіі, біятэхналогіі і фармацэўтыка, прамысловыя тэхналогіі і новыя матэрыялы. Усяго ў з’ездзе навукоўцаў прынялі ўдзел каля 2 тыс. дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

ЗНАЁМЦЕСЯ!

Абноўлены Савет маладых навукоўцаў

Старшынёй Савета маладых навукоўцаў (СМН) БДУ абрана дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права факультэта міжнародных адносін **Наталля Анцух.** Выбары адбыліся на пасяджэнні СМН ВНУ. Таксама намеснікам старшыні калегіяльнага дарадчага органа прызначаны аспірант фізічнага факультэта ВНУ **Аляксандр Фядотаў.** Абноўлены і склад сакратарыята савета. У яго абраны супрацоўнікі філалагічнага факультэта і Інстытута журналістыкі БДУ **Вольга Зуева** і **Алеся Кузьмінава** адпаведна.

Наталля Анцух

«У планах дзейнасці нашага савета – арганізацыя навуковых і метадалагічных мерапрыемстваў для маладых навукоўцаў, рэалізацыя канцэпцыі «Універсітэт 3.0», якая мяркуе камерцыялізацыю навуковай дзейнасці шляхам стварэння стартап-цэнтраў і бізнес-інкубатараў на базе тэхнапарку», – падкрэсліла дзейная старшыня СМН БДУ.

Наталля Анцух брала ўдзел у II З’ездзе навукоўцаў Рэспублікі Беларусь, які адкрыўся 12 снежня ў Мінску, дзе выступіла з дакладам на тэму: «Статус маладога навукоўца ў навуковай супольнасці».

Нагадаем, Савет маладых навукоўцаў БДУ быў створаны ў 2009 годзе як калегіяльны дарадчы орган, які фарміруецца тэрмінам на тры гады. Яго мэтай з’яўляецца каардынацыя працы сістэмы саветаў маладых навуковых структурных падраздзяленняў БДУ. Дзейнасць савета спрыяе прафесійнаму росту маладых навукоўцаў, іх актыўнаму ўдзелу ў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаваннях, праграмах і розных фондах. Акрамя таго, савет спрыяе маладым навукоўцам у арганізацыі сумесных навукова-даследчых і інавацыйных праектаў, удзеле ў канферэнцыях, семінарах, арганізацыі конкурсаў, выданні навуковых і навукова-папулярных прац.

Ульяна МІНЧАНКА

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 студзеня Брылеўскі Міхаіл Мікалаевіч, намеснік дэкана, геаграфічны факультэт

01 студзеня Купрадзэ Святлана Джамалаўна, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, факультэт міжнародных адносін

02 студзеня Чаблакова Людміла Аляксееўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

03 студзеня Рудніцкі Антон Сяргеевіч, прафесар кафедры радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій

08 студзеня Мулярчык Сцяпан Рыгоравіч, загадчык кафедры інфарматыкі і камп’ютарных сістэм, факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій

08 студзеня Барковіч Аляксандр Аркадзьевіч, дацэнт кафедры прыкладной лінгвістыкі, філалагічны факультэт

13 студзеня Чарняк Юрый Генадзьевіч, дацэнт кафедры сацыялогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

21 студзеня Саколік Галіна Андрэеўна, загадчык НДЛ прыкладных праблем таксічнасці прадуктаў гарэння, хімічны факультэт

26 студзеня Шарапа Аляксандр Віктаравіч, прафесар кафедры міжнародных адносін, факультэт міжнародных адносін

27 студзеня Саўчанка Галіна Пятроўна, дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў

27 студзеня Смірнова Юлія Сяргееўна, дацэнт кафедры псіхалогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

28 студзеня Сташкевіч Ігар Вячаслававіч, дацэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, фізічны факультэт

30 студзеня Жаўняк Алег Рыгоравіч, дацэнт кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій, факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій

30 студзеня Пляхімовіч Іван Іванавіч, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права, юрыдычны факультэт

АБ'ЯВЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТА кафедры эканомікі і кіравання бізнесам;
ДАЦЭНТА кафедры кіравання фінансамі;
ДАЦЭНТА кафедры прававых дысцыплін;
ВЫКЛАДЧЫКА факультэта перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7,

Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 3060027, 3060028.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ

АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

НАВУКОВЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ лабараторыі інфармацыйных тэхналогій па спецыяльнасці 05.13.11 (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і камп’ютарных сетак) – 2.

Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэлефон 212-48-43.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Навуковыя секцыі «Моладзь і новыя гарызонты навукі» і «Сучасная хімія і рацыянальнае прыродакарыстанне» прайшлі ў БДУ ў рамках II З’езду навукоўцаў Беларусі – zviazda.by (11.12), БелТА, СТБ, АНТ, «Мінск-навіны», Мінск-ТБ (12.12).

Мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» адбылася ў БДУ – tut.by (02.12), budny.by, ecopress.by, bestbelarus.by (29.11), zviazda.by, minsknews.by, blizko.by (04.12), СТБ (05.12).

БДУ ўвайшоў у Маскоўскі міжнародны рэйтынг «Тры місіі ўніверсітэта» (MosIUR) – tut.by, zviazda.by, БелТА, 21.by, embassybel.ru, rg.ru, obrazovanie.by, n1.by, БелаПАН, naviny.by (12.12), АНТ (20.12).

Каманда БДУ выйшла ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў – kv.by (03.12), БелТА, wuz.by, ecopress.by, zviazda.by (05.12).

Урачыстае адкрыццё цэнтра індалогіі адбылося ў БДУ – minsknews.by, wuz.by, radiomir.by, СТБ, Мінск-ТБ (07.12), zviazda.by (10.12), БТ-1 (11.12).

Пяць залатых медалёў заваяваў пяцікурснік юрыдычнага факультэта БДУ Ігар Бокі на чэмпіянаце свету па плаванні сярод параалімпійцаў – АНТ, sb.by (05.12), БелТА, wuz.by, mst.by, zviazda.by, sportpanorama.by, usitmoik.gov.by (06.12).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Рэйтынг ацэнкі выкладчыкаў:

ад сістэмы крытэрыяў да інструмента рэалізацыі стратэгічнага развіцця

Новы год у нашым універсітэце пачнецца з якасных змен: у БДУ распачнецца паступовае ўкараненне рэйтынгавай сістэмы дадатковага стымулявання работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу. Пра працэс распрацоўкі сістэмы, яе асноўныя крытэрыі і ўплыў на далейшае развіццё нашага ўніверсітэта распавёў Юрый ВАРАТНІЦКІ, старшыня нядаўна створанага савета па лічбавай трансфармацыі.

– Юрый Іосіфавіч, наколькі пытанне ўвядзення рэйтынгавай сістэмы аплаты працы ПВС з'яўляецца актуальным для БДУ?

– Для нас сёння гэта пытанне прынцыповае і стратэгічнае па шэрагу фактараў. *Па-першае,* усім работнікам з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу неабходна даць пэўныя арыенціры галоўных напрамкаў развіцця ўніверсітэта. Любая сістэма ацэнкі працы так ці інакш арыентуе на дзейнасць у напрамках, якія важныя для ўніверсітэта на сучасным этапе яго развіцця. *Па-другое,* для таго, каб дамагчыся павышэння якасці адукацыйнага працэсу ў цэлым, неабходна дасягнуць эфектыўнай і якаснай працы кожнага выкладчыка. Для гэтага зноў жа неабходная сістэма стымулявання эфектыўнай і якаснай працы, трэба даць людзям магчымасць супастаўляць іх уласную працу з той працай, якую праводзяць калегі, гэта значыць патрэбная шкала ацэнкі, і рэйтынгавая сістэма яе дае. *Па-трэцяе,* распрацоўваючы канцэпцыю рэйтынгавай сістэмы, мы вырашалі адразу дзве задачы: тыя крытэрыі, якія выпрацаваны на сёння, будуць працаваць не толькі на рэйтынг, але і, дапоўненыя адзнакамі кафедраў і дэканатаў, актуалізуюць дзейныя крытэрыі прызначэння павышэння тарыфнага акладу выкладчыка.

– Як адбываецца працэс распрацоўкі рэйтынгавай сістэмы? Якія спецыялісты далучаны да гэтага маштабнага праекта?

– Для распрацоўкі рэйтынгавай сістэмы загадам рэктара была сфарміравана працоўная група, у якую ўвайшлі: прарэктар па вучэбнай рабоце, начальнік ГУВНМР, адзін дэкан і два загадчыкі кафедраў. Працу групы курыраваў першы прарэктар *Алег Івашкевіч*, і галоўнай задачай было распрацаваць Канцэпцыю рэйтынгавай сістэмы дадатковага стымулявання работнікаў БДУ з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу. Пасля таго, як былі распрацаваны асноўныя палажэнні гэтай канцэпцыі, яна абмяркоўвалася спачатку на рэктараце, а затым на пашыраным рэктараце разам з дэканамі. Пасля гэтага даць свае заўвагі было прапанавана факультэтам. Працоўная група іх улічыла, і новы варыянт канцэпцыі быў ізноў вынесены на пасяджэнне рэктарата. Зараз з канцэпцыяй можа пазнаёміцца і абмеркаваць яе ўвесь калектыў універсітэта: яна апублікавана на ўнутраным сайце БДУ. Пасля прыняцця канцэпцыі будзе распрацавана Палажэнне пра дадатковае стымуляванне на аснове рэйтынгавых адзнак, у якім будуць адлюстраваны не толькі самі крытэрыі вызначэння рэйтынгу, але і вагавыя каэфіцыенты, па сутнасці, бальныя адзнакі па кожным крытэрыі. Гэты працэс досыць складаны, ён патрабуе мадэлявання наступстваў увядзення тых ці іншых балаў за кожны крытэрый, таму да яго працоўная група ставіцца вельмі адказна, і самі гэтыя балы з'явяцца, я думаю, толькі ў студзені.

– Распавядзіце пра прынцыпы і крытэрыі, пакладзеныя ў аснову рэйтынгавай сістэмы. Як суадносіцца змест рэйтынгу са стратэгічнымі напрамкамі развіцця нашага ўніверсітэта?

– У канцэпцыі сказана, што адной з асноўных мэт увядзення рэйтынгавай сістэмы з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі, адпаведна, і павышэнне канкурэнтаздольнасці ўніверсітэта. Зыходзячы з гэтага, будавалася сістэма рэйтынгавых адзнак. Калі казаць пра навучальную працу, то тут над адзнакамі традыцыйных напрамкаў працы (правядзенне аўдыторных заняткаў, распрацоўка новых навучальна-метадычных матэрыялаў) пераважаюць тыя крытэрыі, якія арыентуюць на мадэрнізацыю мэт, зместу і тэхналогій адукацыйнага працэсу. Тут гаворка ў першую чаргу ідзе пра тое, каб стымуляваць выкладчыкаў выкарыстоўваць інтэрактыўныя методыкі і тэхналогіі, укараняць у навучальны працэс праблемнае, развіццёвае, эўрыстычнае навучанне, тэхналогіі, якія арыентаваны на творчую самарэалізацыю навучэнцаў, на стварэнне імі ўласнага адукацыйнага прадукту. Гэта вельмі важна з пункту гледжання мадэрнізацыі адукацыйнага працэсу, які павінен быць павернуты тварам да навучэнца. Мы павінны разглядаць навучэнцаў нароўні з працадаўцамі і іншымі суб'ектамі, што ўдзельнічаюць у адукацыйным працэсе, па сутнасці, як замоўцаў адукацыйных паслуг.

У нас цяпер вельмі розныя студэнты, мы ўвайшлі ў эпоху ўсеагульнай вышэйшай адукацыі, і вось у гэтых умовах наша задача – не страціць лідарскія пазіцыі, даць магчымасць развівацца студэнтам з самай рознай пачатковай падрыхтоўкай, пры гэтым не страціць самых таленавітых. Таму цяпер з'яўляецца прынцыповым выкарыстанне метадаў і тэхналогій, арыентаваных на самарэалізацыю студэнтаў.

Мы прапануем высока ацэньваць удзел выкладчыкаў у распрацоўцы навучальна-метадычнай дакументацыі, адукацыйных стандартаў, тыпавых навучальных планаў і праграм, у якія ўбудавана выкарыстанне падобных сістэм і тэхналогій. Яшчэ адна форма – гэта правядзенне прамежкавай і выніковай атэстацыі, залікаў і іспытаў не ў традыцыйнай форме: білеты з пытаннямі і адказы – а ў форме творчых даследчых заданняў, якія студэнт можа атрымліваць загадзя, за дзень-два да іспыту, рыхтуе яго і на іспыце абараняе. Таксама высока будзе ацэньвацца кіраўніцтва тымі дыпломнымі працамі, якія часткова апублікаваны або размешчаны ў электроннай бібліятэцы БДУ.

Другі напрамак развіцця – гэта канкурэнтаздольнасць нашай адукацыі на міжнародных рынках. Рэйтынгавая сістэма будзе стымуляваць працу з замежнымі студэнтамі, прыцягненне іх на кафедры і факультэты. Высока будзе ацэньвацца праца з замежнымі навучэнцамі па напісанні дыпломных і магістарскіх прац, правядзенне заняткаў на замежнай мове, чытанне лекцый за мяжой, удзел у адукацыйных праграмах прамога міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва. Да нас па пэўных адукацыйных праграмах прыязджаюць цэлыя групы замежных студэнтаў, і праца з імі павінна таксама адпаведным чынам ацэньвацца.

Трэці напрамак, калі казаць пра навучальную працу, – гэта арыентацыя на працадаўца. Мы прыцягваем студэнта ва ўніверсітэт, вучым яго – і павінны размеркаваць, таму высока ацэньваецца прафарыентацыйная праца, а таксама кіраўніцтва дыпломнымі працамі па тэматыцы, якая замоўлена патэнцыйнымі працадаўцамі.

Што да навукова-даследчай працы, то тут таксама можна вылучыць некалькі асноўных напрамкаў. Першы – падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі, кіраўніцтва абароненымі кандыдацкімі і доктарскімі дысертацыямі, у тым ліку высока ацэньваецца кіраўніцтва працамі, абароненымі ў тэрмін, напісанымі замежнымі аспірантамі. Другі – навукова-даследчыя і вопытна-канструктарскія працы, у першую чаргу фінансаваныя, якія дазваляюць прынесці сродкі ўніверсітэту і павялічыць заработную плату тым, хто іх выконвае. Трэці напрамак паказвае навуковы патэнцыял выкладчыка – гэта публікацыі. Асноўным крытэрыем тут з'яўляецца не столькі лік публікацый, колькі іх выніковасць, гэта значыць тое, як яны цытуюцца. У рэйтынгавай сістэме выкарыстоўваюцца два асноўныя індэксы цытавання: Хірша ў Scopus і H-індэкс у Google Scholar. І яшчэ адзін важны складнік дзейнасці выкладчыка, якая адлюстравана ў рэйтынгу, – арганізацыйная і выхаваўчая работа.

Трэба мець на ўвазе, што агульныя крытэрыі выкарыстоўваюцца і для вызначэння рэйтынгу, і для прызначэння павышэння тарыфнага акладу. Дык вось, для прызначэння ПТА да балаў рэйтынгу дадаюцца яшчэ балы, прызначаныя дэканатамі і кафедрамі за тыя віды прац, якія немагчыма ўлічыць у фіксаваных паказчыках сістэмы. А рэйтынг вызначаецца на падставе аб'ектыўных паказчыкаў, якія, як я адзначыў вышэй, адпавядаюць стратэгічным напрамкам развіцця ўніверсітэта.

– Што ўяўляе сабой працэс кантролю выканання рэйтынгавых паказчыкаў? Наколькі празрыста і адкрыта будзе вызначацца рэйтынг выкладчыка?

– Укараненне рэйтынгавай сістэмы цягне за сабой мадэрнізацыю працэсаў вядзення індывідуальных планаў выкладчыкаў і іншай навучальна-метадычнай дакументацыі, справаздачнасці. Значная частка гэтай працы пераводзіцца ў электронную форму, гэта значыць мяркуецца, што запаўняць індывідуальныя планы

працы выкладчыкі будуць у *асабістых кабінетах*, якія пачнуць працаваць у студзені 2018 года. У электронную форму таксама пераводзіцца вядзенне Картак № 1 і № 2 уліку выканання навучальнай нагрузкі. Адпаведна, уся справаздачная інфармацыя, якую вядуць выкладчыкі, будзе шматкроць верыфікавацца. Напачатку на ўзроўні кафедры, бо індывідуальныя планы і справаздачы па іх кожнага выкладчыка будуць абсалютна празрыстыя для ўсіх супрацоўнікаў кафедры, гэта значыць у першую чаргу выкладчык будзе рабіць справаздачу перад калегамі, а ў другую – перад загадчыкам кафедры, які верыфікуе справаздачу і дадае балы ад кафедры. Наступны этап верыфікацыі – гэта дэканаты, якія праводзяць выбарачную праверку дадзеных і таксама дадаюць свае балы, нагадаю, што гэтыя балы працуюць толькі пры прызначэнні ПТА. І нарэшце, выбарачная верыфікацыя асобных справаздач ляжыць на профільных упраўленнях: Галоўным упраўленні навуковай і вучэбна-метадычнай работы, Галоўным упраўленні навукі, упраўленні выхаваўчай работы з моладдзю. Прычым ніхто ўручную лічыць гэтыя балы не будзе, працэс цалкам аўтаматызаваны, гэта значыць пасля таго, як справаздача запоўнена, балы прызначаны, вызначэнне рэйтынгаў і прызначэнне надбавак за рэйтынгі адбываецца аўтаматычна, аж да аўтаматычнага фарміравання адпаведных загадаў. Ніякай бюракратычнай нагрузкі на кафедры і дэканаты не будзе.

– Ці ўлічваецца спецыфіка гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў пры разліку крытэрыяў рэйтынгу? Відавочна, што ў прыродазнаўцаў больш пераваг быць першымі.

– Крытэрыі, якія ў нас выпрацаваны, працуюць дваяка: на вызначэнне рэйтынгу выкладчыка і на прызначэнне павышэння тарыфнага акладу. Адразу адзначу, што павышэнне тарыфнага акладу прызначаецца ў рамках факультэтаў і ў рамках тых фондаў, якія кожнаму факультэту вылучаюцца, з выкананнем таго дыяпазону павышальных каэфіцыентаў, якія цяпер існуюць, і сярэдняга ў 50 %. Што да рэйтынгу і надбавак за яго, то тут ужо працуе агульнаўніверсітэцкі дадатковы фонд, таму, натуральна, трэба было падумаць пра тое, каб нейкім чынам зраўняць сацыяльна-гуманітарныя факультэты і прыродазнаўчанавуковыя. Гэта зроблена шляхам увядзення дадатковых павышальных каэфіцыентаў па шэрагу крытэрыяў, напрыклад, публікацыі ў выданнях, якія індэксуюцца ў Scopus, міжнародныя кантракты і гасдамоўныя працы. Усім зразумела, што магчымасці тут у сацыяльна-гуманітарных факультэтаў ніжэйшыя, тым не менш мы хочам вельмі сур'ёзна гэтыя напрамкі працы стымуляваць і ў іх, уводзячы павышальныя каэфіцыенты.

– Ці не здаецца Вам, што троху ўшчэмленымі апынуцца маладыя выкладчыкі без ступені, і рэйтынгавая сістэма стане для іх дэматывацыйным элементам?

– У тую канцэпцыю, якая разглядаецца цяпер, закладзена прызначэнне павышэння тарыфнага акладу не ніжэйшага за 50 % для маладых спецыялістаў. Што да рэйтынгу, то не можа быць усё-такі асобных рэйтынгаў для маладых выкладчыкаў і для тых, хто мае вельмі вялікі стаж працы. Наогул, з майго пункту погляду, калі разгледзець паказчыкі нашай рэйтынгавай сістэмы, то, напэўна, у маладых выкладчыкаў не менш, а нават больш магчымасцяў атрымання высокіх адзнак за кошт больш актыўнай працы з моладдзю, выкарыстання новых формаў і метадаў, адукацыйных тэхналогій. Вядома, выкладчык, які мае вялікі стаж працы і высокія навуковыя паказчыкі, будзе выйграваць, напрыклад, па індэксе цытаванасці, але ў моладзі ёсць іншыя магчымасці. Акрамя таго, мы закладваем у сістэму механізмы, якія не дазваляюць атрымліваць высокі рэйтынг за кошт аднабаковай дзейнасці, гэта значыць нават калі ў вас індэкс Хірша роўны ста, толькі гэтага недастаткова для атрымання вельмі высокай рэйтынгавай адзнакі.

– Распавядзіце пра тэрміны запуску новаўвядзення. Калі чакаць першыя вынікі?

– Прызначэнне ПТА і дадатковай надбаўкі за высокія рэйтынгавыя паказчыкі будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Палажэннем, якое будзе распрацавана, пачынаючы з 2019 года, па выніках 2017/2018 навучальнага года і 2018 каляндарнага года. Аднак рэктаратам прынята рашэнне ўжо на 2018 год вылучыць дэканатам сродкі, невялікі фонд дадатковага матэрыяльнага стымулявання для таго, каб яны маглі заахвочваць на сваё меркаванне тых выкладчыкаў, якія актыўна працавалі ў напрамках, прадугледжаных крытэрыямі рэйтынгавай сістэмы.

– Якія якасныя змены чакаюць БДУ пасля запуску і рэалізацыі рэйтынгавай сістэмы?

– Мы спадзяёмся, што перш за ўсё адбудзецца трансфармацыя адукацыйнага працэсу. Яна будзе ажыццяўляцца паступова, але зменяцца мэты, змест, формы адукацыі. Гэта будзе стымуляваць развіццё ўніверсітэта ў стратэгічных напрамках.

Гутарыла
Валерыя БАНДАРЧЫК

МЕРКАВАННІ

Сяргей БАЛАШЭНКА, дэкан юрыдычнага факультэта:

Стварэнне эфектыўных эканамічных механізмаў, якія стымулююць працу структурных падраздзяленняў, прафесарска-выкладчыцкага складу, з'яўляецца важным фактарам для развіцця ўніверсітэта. Сярод магчымых захадаў па павышэнні актыўнасці і фінансавай зацікаўленасці ПВС можна разглядаць:

– заключэнне з навуковым кіраўніком (кансультантам) замежнага грамадзяніна, які навучаецца ў аспірантуры (дактарантуры), грамадзянска-прававой дамовы аплатнага аказання паслуг, што прадугледжвала б выплату штогадовай узнагароды навуковаму кіраўніку (кансультанту) у памеры 50 % ад кошту навучання ў аспірантуры (дактарантуры) БДУ, што можа станоўча адбіцца на экспарце адукацыйных паслуг у гэтай сферы;

– частковая фінансавая самастойнасць факультэтаў адносна сум, што паступаюць ад платных адукацыйных паслуг, самастойнае вызначэнне колькасці ставак ПВС і ВДП (вучэбна-дапаможнага персаналу), фундаваных з пазабюджэтных крыніц. Сродкі ад «зэканомленых» (па нарматывах) ставак могуць пакідацца ў распараджэнні структурных падраздзяленняў для стымулявання супрацоўнікаў, якія паказалі высокія вынікі ў адукацыйнай, навуковай, навукова-метадычнай працы, укараненні адукацыйных інавацый;

– вызначэнне парадку стымулявання супрацоўнікаў факультэтаў пры павелічэнні аб'ёму платных адукацыйных паслуг і ўкараненне новых адукацыйных праектаў;

– занясенне змены ў Палажэнне аб прэміяванні за эфектыўную падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, зацверджанае загадам рэктара ад 06.09.2016 № 409-ОД, прадугледзеўшы магчымасць прэміявання навуковых кансультантаў штатных работнікаў БДУ, якія абаранілі доктарскія дысертацыі;

– адмена на дзяржаўным узроўні кантрольных лічбаў прыёму ў вядучыя вышэйшыя навучальныя ўстановы для абітурыентаў, якія жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю за кошт уласных сродкаў (у тым ліку другой вышэйшай адукацыі);

– і іншыя.

Укараненне ў БДУ рэйтынгавай сістэмы можна разглядаць як сур'ёзны крок на гэтым шляху. Падрыхтаваная Канцэпцыя рэйтынгавай сістэмы дадатковага стымулявання рабонікаў БДУ з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу дазволіць больш аб'ектыўна ацэньваць (і ўзнагароджваць) выкладчыкаў за праробленую працу. Пазітыўнае тое, што кожны з нашага калектыву можа сфармуляваць свае прапановы ў гэты дакумент.

Для правядзення штогадовай атэстацыі ПВС па прызначэнні ПТА (павышэння тарыфнага акладу) падыходзяць агульныя крытэрыі ацэнкі працы, прыведзеныя ў Канцэпцыі. Некаторыя з крытэрыяў могуць удакладняцца падчас іх выкарыстання ў першыя гады пасля ўвядзення сістэмы.

У прыватнасці, прапануецца высока ацэньваць кіраўніцтва дыпломнымі працамі, якія часткова апублікаваны або размешчаны ў электроннай бібліятэцы БДУ. У дадзеным выпадку прапануем частку 3 п. 8 раздзела І агульных крытэрыяў «Навучальная і навучальна-метадычная праца» дапоўніць словамі «па рэкамендацыі ДЭК» (гэта значыць не па жаданні дыпломніка, а ў выніку высокай ацэнкі дыпломнай працы дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй).

Варта замяніць у формуле вызначэння ліку балаў па напрамках IV і V выраз «колькасць супрацоўнікаў» на «колькасць ставак», бо часам на 1 стаўку працуюць 4 супрацоўнікі (па 0,25 стаўкі).

Частка 3 п. 6 «Методыка разліку ПТА на падставе агульнай сістэмы крытэрыяў» патрабуе змены. Прапануем унутраным сумяшчальнікам выстаўляць ПТА загадчыкам кафедры на аснове аналізу крытэрыяў па асноўнай стаўцы, а знешнія сумяшчальнікі запаўняюць усе паказчыкі (паводле п. 1 раздзела І «Навучальная і навучальна-метадычная праца» паказчыкі запаўняюцца да поўнай стаўкі, г. зн. сумяшчальнік на 0,5 стаўкі памнажае паказчыкі на 2; на 0,25 стаўкі – на 4) і ўдзельнічаюць ў атэстацыі на агульных падставах.

Фармулёўка дадзенага пункта ў Канцэпцыі «Сумяшчальнікам (знешнім і ўнутраным) вызначаецца ПТА ў сярэднім памеры, усталяваным для адпаведнай катэгорыі работніка з ліку ПВС», не пакідае матэрыяльнай магчымасці кафедрам і факультэту павялічыць ПТА паспяхова працуючаму ПВС (у тым ліку сумяшчальнікам), бо агульны фонд павышэння па факультэце складае 50 %, а сярэдні памер ПТА сумяшчальніку (у большасці гэта дацэнты) складае 55 %.

Прапанаванае ў Канцэпцыі ўсталяванне павышэння тарыфнага акладу не ніжэй за 50 % для маладых спецыялістаў, па нашым меркаванні, не абгрунтавана. Улічваючы, што ў фарміраванне службовага акладу маладым спецыялістам уваходзіць «значнае» павышэнне тарыфнага акладу выкладчыкам, якія не маюць навуковай ступені, можна абмежаваць ПТА для іх 40 % (як і было раней).

Пасля зацвярджэння Канцэпцыі мяркуецца распрацоўка Палажэння пра дадатковае стымуляванне на аснове рэйтынгавых адзнак, у якім будуць адлюстраваны бальныя адзнакі па кожным крытэрыі. І да гэтай часткі працы па ўкараненні рэйтынгавай сістэмы неабходна падысці вельмі ўзважана і адказна, бо менавіта балы (іх колькасць за кожны крытэрый) і ўсталююць выніковае месца ў рэйтынгу выкладчыка (і кафедры) і адпаведна матэрыяльную ацэнку. Таму Палажэнне неабходна таксама шырока абмеркаваць у калектывах.

У сувязі з тым, што шматлікія крытэрыі не маюць колькаснага значэння, а носяць якасную ацэнку, неабходна максімальна карэктна вызначыць балы, прызначаныя дэканатамі і кафедрамі за тыя віды прац, якія немагчыма ўлічыць у фіксаваных паказчыках сістэмы.

Для юрыдычнага факультэта, які выпускае спецыялістаў па НАЦЫЯНАЛЬНЫМ праве Рэспублікі Беларусь, вельмі складана прытрымлівацца крытэрыяў, якія высока ацэньваюцца ў рэйтынгавай сістэме:

– кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, напісаныя замежнымі аспірантамі;

– праца з замежнымі навучэнцамі па напісанні дыпломных і магістарскіх прац;

– правядзенне заняткаў на замежнай мове;

– чытанне лекцый за мяжой;

– удзел у адукацыйных праграмах прамога міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва.

Лічым, што для юрыдычнага факультэта варта ўвесці асобны павышальны карэкцыйны каэфіцыент як у індывідуальным рэйтынгу ПВС, так і кафедраў і факультэта ў цэлым.

Станоўчым пры ўвядзенні рэйтынгавай сістэмы з'яўляецца тое, што тыя віды заахвочванняў, што сябе ўжо добра зарэкамендавалі, застаюцца ў распараджэнні дэканаў: павышэнне за працу па кантракце, надбаўкі за высокія паказчыкі, штомесячнае і штоквартальнае прэміяванне, разавыя прэміі са сродкаў дадатковага прэміявання і сродкаў перавышэння даходаў над выдаткамі.

Для «адладжвання» механізму рэйтынгавай сістэмы ў БДУ трэба прарабіць яшчэ вельмі вялікую працу – як для працоўнай групы, так і для факультэтаў і кафедраў. У прыватнасці, варта штогод аналізаваць атрыманыя выкладчыкамі факультэта рэйтынгавыя адзнакі, вызначаючы, за кошт чаго яны атрыманы (ці не «накручаны). Кафедры юрыдычнага факультэта з поўным разуменнем і адказнасцю гатовыя да працы па ўкараненні рэйтынгавай сістэмы ў БДУ.

Аляксандр КУРБАЦКІ, загадчык кафедры тэхналогій праграмавання ФПМІ

Прапанаваная сістэма перш за ўсё парадкуе значную частку працэсаў матэрыяльнага стымулявання выкладчыкаў: у частцы прызначэння павышэння тарыфных акладаў і ў частцы выкарыстання сродкаў перавышэння даходаў над выдаткамі. Немалаважна, што, як вынікае з праекта Канцэпцыі, тая частка сродкаў перавышэння даходаў над выдаткамі БДУ, якая будзе накіроўвацца на вызначэнне надбавак прафесарска-выкладчыцкаму складу, істотна ўзрасце. Яшчэ больш важна тое, што ўкараненне новай сістэмы прадугледжвае пераход да беспапяровага вядзення індывідуальных планаў выкладчыкаў і запаўнення імі справаздач у электронным выглядзе. Усе разлікі надбавак мяркуецца цалкам аўтаматызаваць. Гэта можна разглядаць як чарговы крок да лічбавай трансфармацыі адукацыйнай і адміністрацыйнай сфер дзейнасці БДУ.

У цэлым, можна сказаць, рэйтынгавая сістэма карысная, калі яшчэ будзе і «самонавучальнай». Але калі ацэньваць яе карыснасць на дадзеным этапе для «айцішных» факультэтаў, то тут не ўсё так проста і адназначна. Хуткае развіццё IT–індустрыі, працэсы лічбавай трансфармацыі грамадства прывялі за апошнія гады да рэзкага старэння выкладчыцкіх кадраў на гэтых факультэтах і значнага памяншэння прытоку моладзі на выкладчыцкую працу. За кошт рэйтынгавай сістэмы тут станоўчых зменаў чакаць складана. У пэўнай ступені нават наадварот. Актыўнае і хуткае ўкараненне гэтай сістэмы толькі можа адпудзіць «патэнцыйных маладых выкладчыкаў» – яны, як правіла, вельмі не любяць запаўненне ўсялякіх справаздачных дакументаў і залішнюю забюракратызаванасць (з чым мы ўжо і сутыкаемся апошнія гады). Пры гэтым у іх заўсёды ёсць выбар. Яны лёгка могуць знайсці сабе месца пад «парасонам» Парку высокіх тэхналогій, асабліва ў сувязі з падпісаным новым дэкрэтам па ПВТ 2.0. Універсітэтам прыйдзецца яшчэ больш жорстка і больш эфектыўна канкураваць за «маладыя мазгі».

СЛОВА ПРАРЭКТАРАМ

Сузор'е ўніверсітэта ствараецца кожным з вас!

Новы год для большасці з нас самае чаканае свята, якое кожны раз з прыемнымі спадзяваннямі адкрывае новы этап у жыцці. Мы прапанавалі прарэктарам нашага ўніверсітэта падвесці рысу пад мінулым годам і зазірнуць у надыходзячы, адказаўшы на пытанні:

1. Якімі падзеямі, звязанымі з Вашай працай, запомніўся 2017 год?
2. Якія планы збіраецеся рэалізаваць у наступным годзе?
3. Вашы пажаданні БДУ і ўніверсітэцкаму калектыву на Новы год…

Сяргей ХОДЗІН, прарэктар па вучэбнай рабоце:

1. Адыходзячы 2017 год акрэслены важнымі крокамі да стагоддзя БДУ – выхадам у свет першай кнігі гэтай серыі («Интеллектуальная элита Беларуси»), правядзеннем міжнароднай канферэнцыі, якая атрымала высокае прызнанне кіраўніцтва дзяржавы і грамадкасці.

Асабіста для мяне 2017 год – гэта найперш абарона доктарскай дысертацыі.

2. Наступны год, спадзяюся, будзе насычаны канкрэтнай падрыхтоўчай працай, абумоўленай новым праектам Кодэкса аб адукацыі, тымі задачамі, што былі вызначаны на Рэспубліканскай педагагічнай нарадзе і Другім з'ездзе навукоўцаў Беларусі.

Яшчэ спадзяюся падрыхтаваць некалькі падручнікаў.

3. БДУ – першы, і павінен заставацца першым. Сузор'е ўніверсітэта ствараецца кожным з нас. Таму жадаю святла, дабрабыту і цеплыні ў кожным доме, спагады і творчасці ўсім.

Васіль САФОНАЎ, прарэктар па навуковай рабоце:

1. 2017 год – Год навукі. У нашай краіне праходзіла шмат розных мерапрыемстваў – канферэнцый, семінараў, круглых сталоў, выстаў інавацыйнай прадукцыі, накіраваных на развіццё ўзаемадзеяння навуковай сферы з галінамі эканомікі, актывізацыю інавацыйнай дзейнасці, пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва. Вялікая колькасць мерапрыемстваў праведзена на базе БДУ ці з актыўным удзелам універсітэта ў іх арганізацыі. Універсітэт сустрэў 2017 год падвядзеннем вынікаў фестывалю моладзевай навукі, які праводзіўся Міністэрствам адукацыі.

Знакавай падзеяй стаў II З'езд навукоўцаў нашай краіны, у працы якога прынялі ўдзел больш за 140 навукоўцаў нашага ўніверсітэта. БДУ стаў базай правядзення дзвюх секцый з'езду – секцыі «Моладзь і новыя гарызонты навукі» і секцыі «Сучасная хімія і рацыянальнае прыродакарыстанне». На выставах было прадстаўлена звыш 50 універсітэцкіх распрацовак.

У адыходзячым годзе БДУ ўпэўнена павышаў свае пазіцыі ў міжнародных рэйтынгах універсітэтаў, увайшоўшы ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету, і ўпершыню ўвайшоў у Шанхайскі прадметны рэйтынг універсітэтаў па фізіцы.

Важнай падзеяй стала атрыманне УП «Унітэхпрам БДУ» статусу суб'екта інавацыйнай інфраструктуры – навукова-тэхналагічнага парку. У 2017 годзе ва ўніверсітэце пачала рэалізоўвацца Стратэгія камерцыялізацыі вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці.

У абноўленым складзе пачаў працаваць Савет маладых навукоўцаў БДУ.

2. У 2018 годзе патрэбна будзе вялікая праца па завяршэнні фундаментальных і прыкладных НДР трохгадовага цыкла, фарміраванні новых навуковых прац ДПНД і ДНТП на перыяд 2018–2020 гг., развіцці тэхнапарку БДУ, стварэнні на яго базе новых вытворчасцяў і, спадзяюся, новых інавацыйных прадпрыемстваў. У планах удасканаленне, з актыўным удзелам Савета маладых навукоўцаў БДУ, сістэмы ўніверсітэцкай навукі і інавацыйнай дзейнасці, выбудоўванне працы ўніверсітэцкага стартап-цэнтра і бізнес-інкубатара. Плануецца запуск у космас універсітэцкага нанаспадарожніка. І яшчэ шмат чаго іншага…

Хачу запрасіць усіх супрацоўнікаў і навучэнцаў да сумеснай працы па дадзеных кірунках. Толькі разам мы зможам зрабіць так, каб нашы навуковыя гіпотэзы і ідэі ўвасабляліся ў жыццё, менавіта тут – ва ўніверсітэцкіх навуковых лабараторыях і цэнтрах, станавіліся рэальным інавацыйным прадуктам – на вытворчых участках і прадпрыемствах БДУ.

3. БДУ – развіцця і росквіту. Калектыву ўніверсітэта, кожнаму з яго супрацоўнікаў і навучэнцаў – моцнага здароўя, творчых поспехаў і новых здзяйсненняў, дабрабыту, шчасця і ўдачы ў надыходзячым 2018 годзе.

Аляксей ТОЛСЦІК, прарэктар па вучэбнай рабоце:

1. 2017 год запомніўся чарговымі поспехамі БДУ ў міжнародных рэйтынгах. Мы ўпершыню ўвайшлі ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету. Найбольш высокія пазіцыі БДУ займае па такіх крытэрыях, як акадэмічная рэпутацыя і рэпутацыя сярод працадаўцаў. І гэта не выпадкова, многія нашы выпускнікі займаюць вядучыя пазіцыі ў прэстыжных універсітэтах і навуковых цэнтрах, вядучых фірмах свету.

БДУ імкнецца падтрымліваць акадэмічную мабільнасць. Штогод за мяжу выязджае каля тысячы выкладчыкаў і столькі ж студэнтаў па міжнародных праграмах, а таксама для ўдзелу ў канферэнцыях. А калі на міжнароднай канферэнцыі зроблены добры даклад – то гэта яшчэ адзін крок угару для БДУ.

Высокія пазіцыі нашай электроннай бібліятэкі, якая займае першае месца сярод універсітэтаў краін СНД, Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. У нашай базе звыш 130 тысяч дакументаў (артыкулы, манаграфіі, падручнікі) – вынік працы нашых навукоўцаў і выкладчыкаў. Усё гэта сведчыць пра нязменна высокую якасць выкладання ў БДУ, а таксама пра рэпутацыю ўніверсітэта, якая склалася не толькі ў краіне, але і ў свеце. Дасягненні ўніверсітэта – гэта, безумоўна, заслуга ўсяго нашага калектыву. І я хачу падзякаваць выкладчыкам і супрацоўнікам факультэтаў, інстытутаў і нашых падраздзяленняў, якія забяспечваюць дынамічнае развіццё ўніверсітэта.

2. Мы ўсё бліжэй падыходзім да знамянальнай даты – 100-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 25 лютага 1919 года – дата выдання дэкрэта аб стварэнні ўніверсітэта, а 30 кастрычніка 1921 года – пачатак заняткаў і першая лекцыя. Таму разглядаю наступны год як этап падрыхтоўкі да 100-гадовага юбілею, да якога мы павінны падысці ў статусе адной з вядучых ВНУ не толькі краін СНД, але і ўсёй еўрапейскай прасторы. Далейшае развіццё атрымаюць міжнародныя кантакты, акадэмічныя абмены, студэнцкая мабільнасць. Паўнавартасна запрацуе магістратура па перспектыўных напрамках пад кіраўніцтвам вядучых навукоўцаў, што дазволіць у разы павялічыць колькасць магістрантаў. У навуку прыйдзе таленавітая моладзь, будуць адкрыты новыя міждысцыплінарныя спецыяльнасці, створана адзіная сістэма «Электронны ўніверсітэт», і выключана залішняя справаздачнасць. Візітоўка БДУ – якасць адукацыі і навуковых даследаванняў. Менавіта яднанне адукацыі, навукі і вытворчасці дазваляе забяспечыць якасную падрыхтоўку спецыялістаў па самых перадавых напрамках, якія вызначаюць развіццё сучаснага інавацыйнага грамадства.

3. Жадаю ўсяму нашаму вялікаму калектыву атрымліваць не толькі годную зарплату, але і задавальненне ад нашай шматграннай навуковай, педагагічнай і вытворчай дзейнасці. Вядома, жадаю дужага здароўя і поспеху ва ўсіх распачынаннях, каб у новым годзе было шмат прыемных падзей, каб з радасцю прыходзіць на працу і з задавальненнем вяртацца дахаты.

Уладзімір СУВОРАЎ, прарэктар па выхаваўчай і вучэбнай рабоце:

1. 2017 год, нягледзячы на сваю прастату ў матэматычным плане, мной успрымаецца як вельмі няпросты. Няпросты – як у сэнсе задач, якія даводзілася вырашаць, так і ў сэнсе эмоцый, якія часам суправаджалі яго плынь.

Што да падзей, пра якія хацелася б казаць, то працягваюць захапляць нашы студэнты. Ужо звыкла, што якасць арганізацыі іх мерапрыемстваў выклікае павагу, так яшчэ і змястоўнае напаўненне ўсё больш адпавядае вызначэнню ЎНІВЕРСІТЭЦКАЕ. Гэта і спроба асэнсавання ў дыскусіях найважнейшых маральных катэгорый (гонар, выгада, воля…), гэта і поўныя залы пры правядзенні міжуніверсітэцкага паэтычнага форуму, гэта і арганізаваны ў рамках кампаніі барацьбы са СНІДам моладзевы танцавальны фэст BSU DANCE FESTIVAL, гэта праекты «Гарачыя гульні» і «Студэнт на тыдзень» і шматлікае іншае! Ужо разумныя, ужо інтэлігентныя, ужо культурныя, ужо імкнуцца да высокіх мэт, хоць часам і з дзіўнымі імправізацыямі (не без гэтага!) – вось сапраўдны твар студэнцтва БДУ. Менавіта такія студэнты ўжо ствараюць славу ўніверсітэту, менавіта імі ў будучыні БДУ будзе ганарыцца!

Якраз так думаю, праводзячы 2017 год! Дзякуй яму за гэта!

2. Для будучыні важна, каб такіх студэнтаў ва ўніверсітэце была пераважная большасць. Каб такі погляд на студэнцтва падзялялі ўсе супрацоўнікі БДУ, а найлепш – уся краіна.

Гэта сур'ёзная, цікавая і не ўтапічная задача. Прыгледзьцеся, і вы заўважыце: працэс ідзе практычна па ўсіх «франтах»! І ўсё больш магчымасцяў для кожнага асэнсавана і актыўна ў гэтым працэсе ўдзельнічаць. Паспрабуем разумна працаваць у гэтым напрамку.

3. Пажаданнямі на адрас БДУ (я разумею, як набору будынкаў і збудаванняў) я ў газеце ўжо дзяліўся: з узростам прыгажэць!.

Усім «БДУшнікам» жадаю камфортных чалавечых адносін, адчування свабоды і карыснасці, кампетэнтнасці і адкрытасці, сумленнага выканання службовых абавязкаў і інструкцый, а таксама правіл працоўнага распарадку! Так, кахання, вядома! Здароўя і дабрабыту!

Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ, прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці:

1. Год, які сыходзіць, запомніўся мне дзвюма падзеямі:

Упершыню ў чытанні лекцыйнага курса я выкарыстоўваў групу «Укантакце», якую стварыў са студэнтамі. Зразумеў, што можна досыць проста і без адміністрацыйнага рэсурсу выцягнуць студэнтаў з перапіскі ў сацсетках, якая не спыняецца нават падчас лекцыі, а ў самім лекцыйным курсе эфектыўнасць нагляднага матэрыялу ўзрастае.

Па працы ў Нацыянальным цэнтры ўсынаўлення, дзе я правёў вялікую частку года, запомніўся буйны праект: упершыню з 2005 года пераглядзелі алгарытм міжнароднага ўсынаўлення. 30 лістапада падпісалі міжведамасную дамову паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і Камісіяй па міжнародным усынаўленні пры Саўміне Італіі ў новай рэдакцыі. Сур'ёзны вынік гэтага года.

2. Планы на будучы год самыя грандыёзныя, але будаваць планы мы ўсе ўмеем, таму давайце я, напэўна, пра гэта казаць не буду, паспрабую перайсці адразу да рэалізацыі.

3. Што пажадаць дарагому ўніверсітэту? Для таго, каб убачыць усю веліч універсітэта, бо вялікае бачыцца на адлегласці, трэба кудысьці сысці, а потым добра было б вярнуцца. Дык вось, хочацца, каб дарагі ўніверсітэт заставаўся такім жа велізарным і па сутнасці і па змесце, вялікіх поспехаў, вялікіх дасягненняў, вялікіх перамог. А супрацоўнікам хочацца пажадаць, каб у кожнага свяціліся ад шчасця вочы, каб усё атрымлівалася дома і на працы, і каб было разуменне таго, што ў адной вялікай і дружнай сям'і, якой з'яўляецца ўніверсітэт, можна разам рэалізаваць нават самыя адважныя праекты.

Падрыхтаваў
Сяргей ШАФАЛОВІЧ

НАВАГОДНЯЕ АПЫТАННЕ

Дзівоснае побач

Напярэдадні Новага года мы таксама папрасілі заўважных жанчын нашага ўніверсітэта распавесці:

1. Пра сямейныя традыцыі святкавання Новага года.
2. Што дае ім прыемныя эмоцыі ў асабістым жыцці.
3. Пра свае пажаданні ўніверсітэту.

Людміла ХУХЛЫНДЗІНА, начальнік ГУВНМР

1. Новы год для нас – сямейнае свята. Таму і традыцыі звычайныя: ёлка, кот побач з ёлкай. Наш кот – галоўны кантралёр па ёлках, таму калі кату падабаецца, то ёлка атрымалася. Звычайна прыязджаюць і дзеці ўжо са сваімі дзецьмі.

Што да навагодняга стала, то і тут ёсць свае традыцыі. Для сына і мужа гатую аліўе, а другая салата – фруктовая «для гультаяватых»: парэзаць чарнасліў, курагу, арэхі, яблык, апельсіны ці мандарыны, можна вінаград ці разынкі дадаць. Чаму для гультаяватых? А таму, што я не закладваю цэлае ядзерка арэха ў курагу і чарнасліў. Але наогул, я люблю гатаваць што-небудзь новенькае, каб здзівіць блізкіх.

За стол садзімся прыбранымі, імкнучыся адпавядаць тэндэнцыям Новага года. І, вядома, падарункі. Для кожнага свой спецыяльны навагодні мяшэчак. Гэтыя мяшэчкі з падарункамі, як лічыць самае малодшае пакаленне, прыносяць гномікі.

Пасля дванаццаці імкнёмся выйсці на вуліцу. Феерверк запускалі, праўда, толькі аднойчы. З гэтым выдатна справіўся мой брат, які разам з сям'ёй прыязджаў сустракаць Новы год з Масквы.

2. Вандраванні. Вельмі любім падарожнічаць з мужам. З'язджаем або ў тур, або на сваёй машыне адпраўляемся ў новыя месцы за межы краіны. «Пляжны адпачынак» – гэта не пра нас. Але адкрываем новыя месцы не толькі падчас адпачынку. Часам у выхадныя дні адпраўляемся па цікавых месцах у Беларусі.

Падабаецца далучацца і да студэнцкіх груп. На ФМА ёсць энтузіясты, якія праводзяць такія экскурсіі для студэнтаў. Вельмі цікавы праект «Пазнай Беларусь» рэалізаваў і наш Саюз жанчын БДУ.

Мы вельмі любім тэатры. У нас так вырашаецца парой і пытанне пра падарункі на якое-небудзь свята ці дзень нараджэння: квіткі ў тэатр ці на канцэрт. Часцей ходзім у оперны тэатр і Тэатр беларускай драматургіі. Сярод канцэртных праграм падабаецца класіка року: Макарэвіч, Грабеншчыкоў, «Чайф» і г. д.

3. Імкнуцца наперад, ставіць новыя адважныя мэты, нават калі здаецца, што яны занадта амбіцыйныя. Але без гэтага не будзе руху. Марце – і хай вашы мары спраўджваюцца.

Наталля НЯПЕЎНАЯ, начальнік упраўлення кадраў

1. Насамрэч, у нас ёсць традыцыі, не навагоднія больш, а калядныя. Мы адзначаем Каляды 25 снежня. Я – каталічка. І бацькі ў мяне каталікі, з заходняй Беларусі, таму мы ўсёй сям'ёй у абавязковым парадку едзем да мамы ў Гродзенскую вобласць. І ў нас насупраць дома ёсць вялікі касцёл, гэта абавязвае. Падарункі мы рыхтуем таксама да Каляд, а не да Новага года. Абавязкова ёлка з цацкамі і штосьці для дзяцей, таму што адчуванне казкі павінна быць, у першую чаргу менавіта ў малянят. Новы год, як і многія, мы адзначаем у сямейным коле.

У каталікоў ёсць перадкалядная посная вячэра, завецца «вігілія». Традыцыйна гатуюцца не менеш за 12 посных страў. Абавязкова аплатка, ці святы хлеб. Існуе традыцыя, калі ўся сям'я ад галоўнага чалавека дзеліцца ёй у знак падзякі і яднання сям'і.

А яшчэ напярэдадні Каляд прывозяць у касцёл з Іерусаліма Жыватворны агонь, які мы пераносім у нашы дамы, для таго, каб год быў добрым.

Ёлкі мы аздабляем па-рознаму. Летась мы ў вёсцы ўпрыгожылі ёлку з былога СССР: цукеркі, сушкі, вырабы. Размясцілі з ёй пост у Instagram і Facebook. Было вельмі шмат лайкаў. Дома ў нас звычайна «модная» ёлка. Старэйшая дачка ў мяне дызайнер і любіць, каб усё было густоўна і ў новай навагодняй тэндэнцыі.

За стол, вядома, садзімся прыбранымі. Спаліць цыдулку і попел у шампанскае, долар у руках патрымаць, так, гэта, вядома, ёсць.

2. Самая галоўная мая эмоцыя – гэта мой унук, яму сем месяцаў цяпер. Адгэтуль сілы і чэрпаем. Маленькія дзеткі – гэта вельмі-вельмі цікава.

Са звычайнага, што дае станоўчыя эмоцыі: гэта любоў да чытання: і навуковай, і мастацкай, і прафесійнай літаратуры. Я вельмі люблю хатнюю ўтульнасць і ўсё, што з ёй звязана, таму ў мяне павінны быць камфортныя ўмовы пражывання і працы па-за работай. І мне важна, каб усе рэчы ляжалі на сваіх месцах. Люблю вадзіць машыну, у тым ліку адна, таму што гэта і адрэналін, і ў той жа час рэлакс: адцягнуцца ад паўсядзённых думак, паназіраць з акна аўто за прыродай. Люблю ландшафтны дызайн, вышываць люблю і ўмею. Люблю ўсё, што ёсць цікавага ў сацсетках, інтэрнэце, фільмы, болей савецкія, і, вядома, тэатр. Калі ёсць магчымасць, я імкнуся хадзіць на ўсе новыя пастаноўкі ў тэатр імя Янкі Купалы. Любоў да тэатра прышчапіў мне філфак. Калісьці, калі я там вучылася, у нас былі абанементы на ўсе пастаноўкі менавіта ў гэты тэатр. Люблю спорт, у дзяцінстве шмат чаго перапрабавала. Гляджу па тэлевізары з задавальненнем. Асабліва фігурнае катанне.

3. Для мяне ўніверсітэт у жыцці вельмі шмат значыць, і вельмі многае даў. Я хачу пажадаць універсітэту быць маладым, энергічным і натхнёным. У нас працуе вельмі шмат унікальных людзей. І я імкнуся ў працы, каб мой погляд «не замыліўся» і яны не сталі для мяне адной вялікай масай. Любы чалавек на любой пасадзе ў любым статусе для мяне мае значэнне. Гэта асоба, гэта персона, гэта капітал нашай арганізацыі. Я хачу, каб універсітэт, даючы магчымасць нашым працаўнікам рэалізоўваць свае праекты і ідэі, яшчэ больш паспяхова развіваўся, таму што патэнцыял у нас велізарны. І самае галоўнае, каб не толькі ў краіне, але і ва ўніверсітэце быў мір. Каб не было канфліктаў у калектывах, паміж падраздзяленнямі. І з гэтымі людзьмі павінна шмат чаго атрымацца.

А кожнаму з вас напярэдадні навагодніх святаў мне хочацца працытаваць Марка Твэна: «Праз 20 гадоў вы будзеце больш шкадаваць пра тое, чаго не зрабілі, чым пра тое, што зрабілі». Таму адкіньце сумневы. Плывіце прэч ад бяспечнай гавані. Лавіце спадарожны вецер сваімі ветразямі. Даследуйце. Марце. Адкрывайце.

Ірына АНТАНЕВІЧ, начальнік ГУПЭІД

1. Новы год праводжу дома, сустракаю дома з сям'ёй: з мамамі, дачкой і ўнукам. Ёлку ставіць муж, загадзя, 25 чысла, і потым пасля старога Новага года прыбірае. Упрыгожваю яе я. У нас падзел працы. З улюбёных страў – можа, смешна – але гэта аліўе. Таму што я вельмі практычная і люблю лаканічныя стравы. За стол мы, вядома ж, прыбіраемся, і ёсць у мяне такая традыцыя: перад Новым годам я купляю свечку – знак наступнага года, і ў навагоднюю ноч я спальваю свечку, якая ў мяне стаяла цэлы год – знак года, які сыходзіць. Часам у навагоднюю ноч ідзём на ёлку на вуліцу, якая ў нас побач.

2. Зараз я чэрпаю сілы ў сваім унуку. Ён у мяне выдатны. Вельмі люблю кнігі чытаць і КВЗ паглядзець. З КВЗ я адпачываю, атрымліваю станоўчыя эмоцыі.

3. Я жадаю ўніверсітэту толькі росквіту. Каб мы заўсёды ішлі заўсёды наперад, не азіраліся назад, і каб універсітэт заставаўся і маладым і ў той жа час сталым, вопытным, дасведчаным. А гэта даюць людзі. Шчасця Вам, здароўя і развіцця.

Таццяна КАЎШЭВІЧ, начальнік ГУБУіФ

1. Новы год традыцыйна сустракаю ў коле сям'і, і гэта не проста святочны стол з абавязковым аліўе і мандарынамі. Штогод мы ставім хатні навагодні спектакль-квэст, дзе рэжысёрам і майстрам па касцюмах выступаем мы з унучкай. Сцэнарый і касцюмы прадумваюцца загадзя. Удзельнікі сям'і выступаюць у ролі сесійных акцёраў, якія ніколі не ведаюць, што за спектакль і чым ён скончыцца. Гэта заўсёды весела і цікава.

2. Вельмі люблю чытаць, прычым кнігі разнапланавыя. Кнігі дапамагаюць адпачыць мозгу ад бухгалтарскага ўліку, які падобны да матэматыкі, патрабуе выразнасці і канкрэтыкі ў дзеянні.

І яшчэ падабаецца оперны тэатр. Заўсёды вадзіла сваіх дзяцей туды і цяпер імкнуся хадзіць з унучкай. Вельмі працяглы час мы з дзецьмі 31 снежня хадзілі на «Лебядзінае возера». Спадзяюся, што неўзабаве гэта традыцыя адновіцца.

3. Не за гарамі чараўніцтва Каляд і Новага года. Хай надыходзячы год будзе для вас паспяховым, а праца будзе вам у задавальненне, хай прыносіць радасць, задавальненне і новыя прафесійныя дасягненні. Хай побач з вамі заўсёды будуць вашы родныя і блізкія людзі, адданыя сябры.

Новы год звычайна звязваюць з надзеямі на лепшае, таму хай усё добрае, што цешыла вас у годзе, які сыходзіць, абавязкова знойдзе працяг у годзе наступным. Хай жыццё ў Новым годзе будзе яркім, шматспадзеўным і шчодрым. Выдатнага настрою, шмат шчаслівых дзён у годзе і, вядома, фінансавай стабільнасці.

Здароўя і шчасця ўсім у Новым годзе!



Ірына КАЗАКОВА, старшыня ГА «Саюз жанчын БДУ»

1. Колькі я сябе памятаю, з ранняга дзяцінства, гэта свята заўсёды заставалася сямейным. Пакуль была дачка маленькая і бацькі, мы заўсёды збіраліся ў нас дома. Цяпер, на жаль, бацькоў няма, але закладзеныя імі традыцыі захоўваюцца. Прыходзіць дарослая ўжо дачка, могуць прыехаць яшчэ свайкі, блізкія сябры.

На стале ў нас заўсёды ёсць хатняя выпечка: пірог ці пірагі, торт ці якая-небудзь экзатычная запечаная страва. Рэцэпты яблычнага пірага і самага смачнага торта «Напалеон» перадаюцца ў нашай сям'і з пакалення ў пакаленне. Традыцыйна ў славян на ўсе святы і, вядома ж, на Новы год павінны быць пірагі. Добра пад Новы год запальваць свечкі. Гэты маленькі агеньчык спаліць усё дрэннае, усе беды і нягоды. Усе ў нашай сям'і перад навагоднім застоллем апранаюцца святочна. Існуе традыцыя: у Новы год трэба апрануць тры новыя рэчы, пажадана ў колеры года, і тады жаданні выканаюцца.

2. Трэба любіць жыццё, шанаваць кожнае імгненне, правільна расстаўляць прыярытэты і разумець, што само чалавечае жыццё і здароўе – гэта і ёсць самае галоўнае. Ну, а адно з самых улюбёных маіх захапленняў – гэта вандраванні, знаёмства з іншымі краінамі, культурамі, традыцыямі, выбітнасцямі. Гэта той багаж, які застаецца з табой на ўсё жыццё. І я ўсім жадаю выдатных, яркіх уражанняў.

3. Усёй універсітэцкай супольнасці я жадаю здароўя, кахання, гармоніі, шчасця і даўгалецця. Я ўжо амаль 35 гадоў ва ўніверсітэце, і для мяне ён – таксама родны дом. Мы выхоўваем будучую інтэлігенцыю нацыі. Мне б хацелася, каб кожны гэта ўсведамляў і каб наш універсітэт стаў найлепшым універсітэтам у свеце. Можа, гэта гучыць злёгку пафасна, але трэба ставіць высокія мэты і імкнуцца іх дасягаць. З Новым годам, БДУ!

Падрыхтавала
Таццяна БАГАМАЗАВА

УШАНАВАННІ

Студэнты года

Вынікі конкурсу «Студэнт года» падведзены ў БДУ. Пераможцы вызначаны ў чатырох намінацыях.

У катэгорыі «Навука» сярод прыродазнаўча-тэхнічных навук найлепшай стала пяцікурсніца фізічнага факультэта *Таццяна Качаткова*; сярод сацыяльна-гуманітарных – чацвёртакурсніца юрыдычнага факультэта *Эльжбета Скшыдлеўска*.

У намінацыі «Лідар» адзначаны тры пераможцы ў катэгорыі «Універсітэт» – чацвёртакурснік Інстытута журналістыкі Кірыл Карабан і пяцікурсніца хімічнага факультэта Кацярына Фянчук, у катэгорыі «Факультэт» – чацвёртакурсніца хімічнага факультэце Анастасія Шабан.

У намінацыі «Спорт» пераможцам прызнаны трэцякурснік факультэта філасофіі і сацыяльных навук Глеб Алексін, а ў «Культуры» перамогу атрымала студэнтка трэцяга курса Інстытута журналістыкі Лідзія Заблоцкая.

Перамога ў конкурсе «Студэнт года» прысуджаецца студэнтам, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай працы, грамадскім, спартыўным і культурным жыцці нашага ўніверсітэта, а таксама дзейнасці ў органах студэнцкага самакіравання за 2016/2017 навучальны год.

Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 69 студэнтаў, якія маюць найлепшыя вынікі ў сваёй адукацыйна-навуковай і грамадскай дзейнасці. Журы ўзначаліў прарэктар па выхаваўчай і вучэбнай рабоце Уладзімір Суворай.

НАМІНАЦЫЯ «КУЛЬТУРА»

Лідзія ЗАБЛОЦКАЯ, прадстаўнік Беларусі на міжнародным песенным конкурсе Youthvision (4 месца, Азербайджан, Баку), уладальнік гран-пры раённага фэсту патрыятычнай песні, прысвечанага 40-годдзю стварэння Маскоўскага раёна г.Мінска, старшыня Творчага саюза БДУ, старшыня Творчага саюза Інстытута журналістыкі БДУ, ідэйны натхняльнік і арганізатар універсітэцкага паэтычнага форуму, арганізатар фэсту першакурснікаў «YFM. #тынаволне»:

– БДУ – гэта неверагодная пляцоўка, каб максімальна ярка раскрыць свой патэнцыял. Адчула гэта на першым курсе, калі сустрэлася з творчымі студэнтамі і выкладчыкамі. У кожнага гарэлі вочы. Яны, іх праекты натхнялі – і я проста атрымлівала задавальненне ад кожнай хвіліны праекта.

Дзякуй БДУ і за тое, што ён даў мне сцэну. Для чалавека, які спявае з 4 гадоў, гэта важна. Рада, што працягнула тварыць. І я бачу аддачу публікі. Ніякіх рамак – толькі творчасць і імкненне наперад. У нашым універсітэце мноства «дзвярэй». Галоўнае – жаданне. Абяцаю надалей натхняць хлопцаў і дзяўчат для развіцця:)

НАМІНАЦЫЯ «ЛІДАР», ПАДНАМІНАЦЫЯ «ФАКУЛЬТЭТ»

Анастасія ШАБАН, арганізатар студэнцкага турніру прыродазнаўчанавуковых дысцыплін, сябра журы абласнога турніру юных хімікаў, удзельнік міжнароднага студэнцкага форуму «Святло Вялікай Перамогі», старшыня прафбюро хімічнага факультэта, сябра Савета БДУ, удзельнік праекта «Экастыль БДУ»:

– БДУ – гэта самы найлепшы ўніверсітэт нашай краіны! Самая лепшая моладзевая пляцоўка для рэалізацыі сябе як асобы, лідара, будучага спецыяліста і проста прыстойнага чалавека! БДУ падарыў мне людзей, якія паверылі ў мае сілы, пасялілі ўпэўненасць, ахінулі цяплом і зычлівасцю. Менавіта тут, я змагла сябе выявіць і ў чарговы раз пераканацца ў тым, што вельмі шматлікае залежыць ад нас самих і людзей, якія заўсёды побач.

кай асамблеі БДУ, арганізатар II міжнароднага моладзевага форуму «М.І.Р. – гэта наша будучыня», арганізатар міжнароднага студэнцкага форуму «Святло Вялікай Перамогі», кіраўнік праекта «Студэнт БДУ на тыдзень»:

– Прыемна ўсведамляць, што гады майго станаўлення супадаюць з часам, праведзеным у БДУ – ва Універсітэце з вялікай літары. Тут нараджаліся ідэі праектаў і конкурсаў, перадаваўся досвед ад старэйшых да малодшых. Тут ты знаёміўся, даведваўся людзей і пазнаваў сябе самога, сталеў.

Няспынная працоўная атмасфера, у якой ты вучыўся жыцці, – агульная заслуга студэнтаў, выкладчыкаў і адміністрацыі.

Дарэчы, выдатна, што ў БДУ добрых студэнтаў заахвочваюць за працу і дасягненні. Гэта, бясспрэчна, дае стымул табе і іншым працаваць з большым запалам.

Кажу «дзякуй» універсітэту не толькі за інтэлектуальнае, але і за культурнае развіццё.

НАМІНАЦЫЯ «ЛІДАР», ПАДНАМІНАЦЫЯ «УНІВЕРСІТЭТ»

Кацярына ФЯНЧУК, кіраўнік адукацыйнага семінара-трэнінгу «КУЛ: Клуб Упэўненых Людзей», старшыня студэнцкага савета інтэрната № 2 БДУ, намеснік старшыні каардынацыйнага савета Студэнцкага гарадка БДУ, арганізатар дабрачыннай акцыі «Годнае дзяцінства», валанцёр Рэспубліканскага педагагічнага савета, член Савета БДУ:

– БДУ – гэта магутная пляцоўка для рэалізацыі зусім любых ідэй! БДУ як краўдфандынгавая пляцоўка, самая круцейшая, таму што акрамя фінансавання, тут лёгка можна знайсці зацікаўленую аўдыторыю, працоўную групу, найлепшых сяброў і натхненне для новых праектаў. За 5 гадоў навучання студэнцкі гарадок стаў для мяне другім домам і сапраўднай сям'ёй, дзе ў патрэбны момант можна знайсці абарону, апору, падтрымку і стымул да дзеяння. Дзякуй вам!

Многія вяршыні ўжо дасягнутыя, аднак ужо намечаны і новыя мэты! Што ж, працягнем!

НАМІНАЦЫЯ «НАВУКА», ПАДНАМІНАЦЫЯ «САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫЯ НАВУКІ»



Эльжбета СКШЫДЛЕЎСКА, лаўрэат V Міжнароднай алімпіяды па міжнародным праве (дыплом 3 ступені), лаўрэат міжнароднага конкурсу даследчых прац «Прасвятленне навукі–2017» (дыплом 2 ступені), лаўрэат IX міжнароднай канферэнцыі-конкурсу па ўсіх навуках «Сусветныя навуковыя веды трэцяга тысячагоддзя» (дыплом 3 ступені), старшыня прэс-службы студэнцкага навуковага савета юрыдычнага факультэта, арганізатар VII міжнароднага летняга ўніверсітэта БДУ «Абарона правоў спажыўцоў у сучасным грамадстве»:

– БДУ – гэта платформа з велізарнай колькасцю розных магчымасцяў. Ад удзелу ў навуковых канферэнцыях да грамадскіх мерапрыемстваў, у рамках якіх мы можам рэалізоўвацца – атрымліваць новыя веды, асвойваць практычныя навыкі. Таксама ўніверсітэт дае магчымасць стажыровак ва ўніверсітэтах іншых краін, што дазваляе дапоўніць свае веды заканадаўствам замежных дзяржаў і ў той жа час займець новыя магчымасці і знаёмствы.

НАМІНАЦЫЯ «НАВУКА», ПАДНАМІНАЦЫЯ «ПРЫРОДАЗНАЎЧА-ТЭХНІЧНЫЯ НАВУКІ»

Таццяна КАЧАТКОВА, пераможца XXIII Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў (дыплом 2 катэгорыі), уладальнік стыпендыі імя А. Н. Сеўчанкі, уладальнік дыплома за найлепшае выступленне на Міжнароднай летняй школе ў Чэхіі, староста групы і курса:

– Кожны студэнт БДУ атрымлівае не толькі якасную адукацыю, але і цэлы спектр магчымасцяў для самарэалізацыі. Я вельмі ўдзячная нашым выкладчыкам за ўсе веды і досвед, якія яны перадаюць нам кожны год. Менавіта дзякуючы іх падтрымцы і самааддачы, у студэнтаў ёсць магчымасць атрымаць поспех як у вучобе, так і ў навуковай і грамадскай дзейнасці ўніверсітэта.

НАМІНАЦЫЯ «СПОРТ»

Глеб АЛЕКСІН, прызёр Еўрапейскіх студэнцкіх гульняў–2016 у Заграбе ў раздзеле «Мужчынскае каманднае ката» (2 месца), пераможца чэмпіянату Беларусі 2017 года, пераможца ўніверсіяды–2017 у «Мужчынскім камандным ката», выканаў нарматыў майстра спорту:

– Вучоба ў БДУ – гэта час магчымасцяў! Хтосьці знаходзіць сяброў, хтосьці працу, хтосьці займаецца ўлюбёнай справай. Падчас навучання мне ўдалося выканаць нарматыў на майстра спорту, за што я бясконца ўдзячны майму трэнеру Кацярыне Мікалаеўне Лысенцы. Я ўдзячны ўніверсітэту за добрыя ўмовы для заняткаў спортам.

Падрыхтавала Наталля КАПАЦЭВІЧ

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Найлепшыя моладзевыя праекты

У БДУ падведзены вынікі конкурсу «Найлепшы моладзевы праект БДУ–2017».

Гран-пры ганараваны праект **«Студэнцкага тэлебачання»** ВНУ. Ён накіраваны на максімізацыю інфармацыйнага ахопу мэтавых аўдыторый за кошт стварэння відэакантэнту студэнтамі ўніверсітэта.

У намінацыі «УНІВЕРСІТЭТ» першае месца заняў праект студэнцкага саюза Інстытута журналістыкі БДУ **«Студэнт на тыдзень».** Акцыя **«Карані»** студэнцкага літаратурнага гуртка «КЛУмБа» і праект **«Універсітэцкі паэтычны форум»** творчага саюза падзялілі другое месца. На трэцяй пазіцыі – праект Інстытута журналістыкі БДУ **«Гарачыя гульні»**.

У намінацыі «ФАКУЛЬТЭТ» першае месца прысуджана праекту хімічнага факультэта **«Віртуозы хімічнага эксперыменту»**. Другога месца ганараваны БРСМ факультэта філасофіі і сацыяльных навук і студэнцкі савет па якасці адукацыі механіка-матэматычнага факультэта за праекты **«Студэнцкая ліга маладых выбаршчыкаў»** і **«Публіка і я»** адпаведна. На трэцім месцы два пераможцы: Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла за **«Асветніцкі лекторый, прысвечаны юбілейнаму году 500-годдзя перакладу і выдання Бібліі доктарам Францыскам Скарынам»** і юрыдычны факультэт з акцыяй **«Мы памятаем, мы ганарымся, мы імкнёмся!»**.

Конкурс праводзіўся ў тры этапы: прэзентацыя праектаў і атрыманне грантаў на іх рэалізацыю; увасабленне праектаў на працягу года; дэманстрацыя вынікаў і падвядзенне вынікаў.

Усяго за права звацца «найлепшым» спаборнічалі 36 моладзевых праектаў. Самыя годныя з іх накіруюцца на рэспубліканскія і міжнародныя конкурсы: «100 ідэй для Беларусі», а таксама конкурс найлепшых камунікацыйных праектаў Расіі, СНД і Усходняй Еўропы Eventiada Awards.

Арганізатарам конкурсу выступіла ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

29 снежня 2017 года
Падпісана да друку 27.12.2017 г.
Зак. 773. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by